# КАБ НА ТАКАВІШЧАХ ЗАЎСЁДЫ БЫЛО «ГУСТА»,

## ды і ў нашых вадаёмах — не пуста!

**Наша краіна па праве славіцца прыроднымі багаццямі. Але гэты рэсурс не бясконцы, асабліва калі ставіцца да яго не па-гаспадарску. Ад дзейнасці чалавека часта залежыць вельмі многае. Сёння спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь раскажуць, якія віды рыб можна здабываць пры аматарскім рыбалоўстве і колькі ў нашай краіне налічваецца рыб-чырванакніжнікаў. Нагадаюць, чым небяспечная на вынікі нарыхтоўка звыш нормы такой папулярнай прынады, як матыль. Таксама чытачы даведаюцца, якія ўмовы патрэбны для гнездавання і размнажэння цецерукоў і глушцоў і колькі ў нас гэтых птушак.**

### Пра рыб-абарыгенаў і не тутэйшых

**Беларусь — край азёр і рэк, нездарма яе называюць Сінявокай. Акрамя таго, краіна мае значную колькасць вялікіх і малых штучных вадаёмаў — вадасховішчаў, сажалак, каналаў, залітых вадой пясчаных і тарфяных кар'ераў. І практычна ва ўсіх ёсць рыба. У цяперашні час навукоўцамі адзначана 65 відаў і падвідаў рыб, якія насяляюць водныя прасторы Беларусі.**



Цяперашні відавы склад шмат у чым створаны дзейнасцю чалавека. З-за ўмяшання людзей у натуральны ход прыродных падзей на працягу апошніх стагоддзяў з нашай іхтыяфаўны зніклі прахадныя асятровыя і выразуб, некаторыя віды сталі рэдкімі. За гэты ж час іхтыяфаўна Беларусі папоўнілася новымі відамі, да распаўсюджвання якіх у той ці іншай ступені зноў жа мае дачыненне чалавек.

Так, 16 відаў рыб, якія жывуць у беларускіх рэках і вадаёмах, не з'яўляюцца абарыгеннымі і трапілі да нас з прычыны натуральнага заходу альбо перанесены чалавекам. Найбольш вядомым акліматызантам з'яўляецца карась сярэбраны, які паспяхова натуралізаваўся. Колькасць асобных відаў (таўсталобік, амур, вугор) падтрымліваецца штучна за кошт зарыблення. Сярод рыб, якія трапілі да нас, ёсць і чужародныя віды. Напрыклад, галавешка-ратан ужо практычна цалкам выцесніў азёрнага гальяна, які цяпер занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь як рэдкі від, што знаходзіцца на мяжы знікнення.

Згодна з Правіламі рыбалоўства, аб'ектамі аматарскай лоўлі могуць быць любыя віды рыб, за выключэннем відаў, занесеных у Чырвоную кнігу, а таксама відаў, лоўля якіх забаронена або часова абмежавана. Такім чынам, пры аматарскім рыбалоўстве фактычна могуць здабывацца 55 відаў рыб, якія належаць да розных атрадаў і сямействаў.

На падставе пастановы Мінпрыроды ад 9.06.2014 года №26 у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь уключаны: сцерлядзь, атлантычны ласось, кумжа, фарэль ручаёвая, еўрапейскі харыус, рыбец (сырць), еўрапейская корушка, вусач, гальян азёрны (выключаны рапушка і падуст). У выпадку вылаву такой рыбы яна павінна быць выпушчана ў рыбалоўныя ўгоддзі ў жывым выглядзе. Да чырванакніжнікаў адносяцца і іншыя прадстаўнікі водных жывёл: рачная мінога (атрад міногападобных) і рак шыракапальцы. Аматарская лоўля вугра ў Беларусі таксама пад забаронай. Азнаёміцца з відамі рыб і водных жывёл, здабыча якіх забаронена, можна ў выдадзеным Дзяржаўнай інспекцыяй календары на 2017 год.

За кожную асобіну незаконна вылаўленай чырванакніжнай рыбы спаганяецца шкода. Яе памер роўны трохразова памнажанай таксе. Устаноўленыя заканадаўствам таксы: вусач — 12 базавых велічынь, сцерлядзь — 10, рыбец — 9, стронга ручаёвая і харыус — 6, атлантычны ласось, кумжа, еўрапейская корушка — 3, азёрны гальян — 0,3 базавай велічыні. Вугор падпадае пад дзеянне Канвенцыі аб міжнародным гандлі відамі флоры і фаўны, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення (СІТЕС). Пры вылаве вугра шкода спаганяецца ў падвоеным памеры, за адну асобіну — 30 базавых велічынь.

### Лічынкі як крыніца прыбытку

**Не кожны рыбак ведае, што лічынкі хірамід або лічынкі камароў-званцоў — гэта не што іншае, як звычайны матыль, які выкарыстоўваецца паўсюдна рыбакамі. Сярод аматараў падлёднай лоўлі попыт на матыля зімой досыць высокі. І гэта зразумела, бо матыль з'яўляецца адной з найлепшых прынад для лоўлі рыбы.**

Купляючы матыля, мала хто задумваецца пра законнасць яго здабычы. На жаль, не рэдкія выпадкі, калі лічынак здабываюць з перавышэннем устаноўленых заканадаўствам нормаў для далейшага іх продажу. У асобных выпадках маса лічынак, здабытых адным парушальнікам за суткі, дасягае 10 кілаграмаў, што перавышае сутачную норму ў 100 разоў. Наўрад ці такая колькасць прынады патрабуецца для ўласных патрэб рыбака.

У адпаведнасці з правіламі здабычы, нарыхтоўкі і (або) закупкі дзікіх жывёл, якія не адносяцца да аб'ектаў палявання і рыбалоўства, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 02.06.2006 года №699, сутачная норма здабычы лічынак хіранамід грамадзянамі ў асабістых мэтах складае 0,1 кілаграма. Акрамя таго, матыля забараняецца здабываць у цёмны час сутак, а таксама ў час нерасту асноўных відаў рыб. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 08.12.2005 года №580 устаноўлена такса за незаконную здабычу матыля ў памеры шасці базавых велічынь за кілаграм.

Менавіта попыт на матыля падахвочвае асобных грамадзян парушаць закон. Аднаго з іх у канцы мінулага года затрымалі работнікі Верхнядзвінскай міжраённай інспекцыі на возеры Расона Расонскага раёна. Замест належных 100 грамаў ён паспеў намыць 350 грамаў матыля. Быў распачаты адміністрацыйны працэс па частцы 4 артыкула 15.32 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь, санкцыя артыкула прадугледжвае накладанне штрафу ў памеры да 20 базавых велічынь. Усяго за мінулы год на тэрыторыі зоны адказнасці Верхнядзвінскай міжрайінспекцыі выяўлена 16 выпадкаў незаконнай здабычы лічынак хіранамід.

Варта адзначыць, што працэс здабычы матыля дастаткова няпросты і патрабуе значных часавых выдаткаў, пэўных ведаў тэхналогіі самой здабычы і далейшага захоўвання.

### Як там справы на такавішчах?

**Цецеруку і глушцу, якія аднесены да паляўнічай жывёлы, для гнездавання і размнажэння неабходныя спецыяльныя ўмовы. Менавіта таму Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання забараняюць знішчаць расліннасць і праводзіць рубкі галоўнага карыстання лесу, лесааднаўленчыя і лесаахоўныя работы ў месцах знаходжання глушцовых і цецеруковых такавішчаў, а таксама ў 300-метровай паласе вакол іх (выключэнні складаюць мерапрыемствы па прадухіленні зарастання такавішча). Такія асабліва ахоўныя ўчасткі павінны выдзяляць усе карыстальнікі паляўнічых угоддзяў, на тэрыторыі якіх ёсць такавішчы.**

Як выконваюцца гэтыя патрабаванні заканадаўства, інспектары правяралі ў ходзе рэйдаў на працягу мінулага года, а спецыялісты Дзяржінспекцыі абагульнілі інфармацыю пра колькасць і месца размяшчэння глушцовых і цецеруковых такавішчаў, колькасць улічаных на іх птушак. Такім чынам, на тэрыторыі паляўнічых угоддзяў Беларусі налічваецца 577 глушцовых і 1841 цецеруковых такоў. Колькасць улічаных у веснавы перыяд 2016 года на гэтых такавішчах птушак складала 6,4 тысячы асобін глушца і 35,1 тысячы асобін цецерука.

У цэлым знакавых парушэнняў заканадаўства падчас праверак выяўлена не было. Разам з тым, вывучыўшы матэрыялы адводу на правядзенне высечак галоўнага карыстання ДЛГУ «Гарадоцкі лясгас», дзяржінспектары ўстанавілі, што тэрыторыя асабліва ахоўных участкаў уключана ў ведамасць разліковай лесасекі на 2016 год. А дакументацыя некаторых карыстальнікаў паляўнічых угоддзяў (напрыклад, у Лёзненскім, Смаргонскім, Глыбоцкім раёнах) і зусім не змяшчала звестак пра выдзяленні асабліва ахоўных участкаў. Кіраўнікам гэтых устаноў прадпісана ліквідаваць парушэнні.

У якасці адной з мер, накіраваных на ахову цецеруковых, Дзяржінспекцыя прапанавала стварыць рэспубліканскі рэестр асабліва ахоўных участкаў у месцах знаходжання глушцовых і цецеруковых такавішчаў (у рамках дзяржаўнага кадастру жывёльнага свету). Ініцыятыва знайшла сваё адлюстраванне ў пастанове Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### ■ Май на ўвазе

### Ракаў і матыля не чапаць!

**Пра забарону на здабычу, нарыхтоўку і (або) закупку некаторых дзікіх жывёл, якія не адносяцца да аб'ектаў палявання і рыбалоўства, праінфармавала Мінпрыроды.**

Так, у адпаведнасці з падпунктамі 51.1.2. і 51.1.5. пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 чэрвеня 2006 года №699, забараняецца здабыча, нарыхтоўка і (або) закупка наступных дзікіх жывёл, якія не адносяцца да аб'ектаў палявання і рыбалоўства.

Лічынак хіранамід (або лічынак камароў-званцоў ці звычайнага матыля) у рыбалоўных угоддзях:

Брэсцкай і Гомельскай абласцей — з 20 сакавіка па 18 мая, Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцей — з 1 красавіка па 30 мая, Віцебскай вобласці — з 10 красавіка па 8 чэрвеня, а таксама ў цёмны час сутак.

Дакумент таксама распаўсюджваецца на даўгапальцага (вузкапальцага) рака: забарона дзейнічае ў рыбалоўных угоддзях Брэсцкай і Гомельскай абласцей — з 20 сакавіка па 18 мая; Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцей — з 1 красавіка па 30 мая; Віцебскай вобласці — з 10 красавіка па 8 чэрвеня; А таксама — яйцаносных самак і самак з лічынкамі на працягу ўсяго года; з даўжынёй цела менш за 10,5 сантыметра (ад вострага рострума да канца цельсана); з выкарыстаннем больш чым трох раколовак на чалавека (грамадзянамі ў асабістых мэтах); з пакіданнем раколовак без нагляду (грамадзянамі ў асабістых мэтах); з выкарыстаннем асвятляльных прыбораў і (або) плавальных сродкаў, а таксама лоўля рукамі ў цёмны час сутак; з выкарыстаннем іншых прылад здабычы дзікіх жывёл, за выключэннем раколовак (грамадзянамі ў асабістых мэтах) ■


## ОЗЕРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**Узденского района Минской области сообщает о проведении 10 мая 2017 года по адресу: аг. Озеро, ул. Дзержинская, 27б в 10.00 открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфаструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | Минская область, Узденский район, Озерский с\с, аг. Озеро, ул. Жасминовая, уч. №49, кадасторовый номер 625682508601000889, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1212 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 23 000,00 | 1 377,60 + публикация в газете | 2 300,00 |
| 2 | Минская область, Узденский район, Озерский с\с, аг. Озеро, ул. Березовая, уч. №10, кадасторовый номер 625682508601000586, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1500 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 23 000,00 | публикация в газете | 2 300,00 |
| 3 | Минская область, Узденский район, Озерский с\с, д. Нитиевские, ул. Центральная, уч. №17а, кадасторовый номер 625682508101000060, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1381 | Возможность подключения к электроснабжению, асфальтированный подъезд | 7 500,00 | 1 278,18 + публикация в газете | 750,00 |
| 4 | Минская область, Узденский район, Озерский с\с, аг. Озеро, ул. Луговая, уч. №48, кадасторовый номер 625682508601000890, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1497 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 23 000,00 | 1 302,43 + публикация в газете | 2 300,00 |
| 5 | Минская область, Узденский район, Озерский с\с, д. Безмены, ул. Солнечная, уч. №24, кадасторовый номер 625682500601000033, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1557 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, асфальтированный подъезд | 11 000,00 | публикация в газете | 1 100,00 |
| 6 | Минская область, Узденский район, Озерский с\с, аг. Озеро, ул. Вишневая, уч. №22, кадасторовый номер 625682508601000520, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1500 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 23 000,00 | 605,45 + публикация в газете | 2 300,00 |

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет №3641062500143 в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 60011054, код платежа 4901, получатель – Озерский сельский исполнительный комитет.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Озеро, ул. Дзержинская, 27б. Последний день приема заявлений – 2 мая 2017 года до 17.00.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

1) заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

3) копию документа, содержащего его идентификационные сведения (ксерокопию паспорта);

4) представителям гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукционов и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

**Более подробную информацию об аукционах, условиях участия можно получить по телефонам: (801718) 49-3-42, 49-3-47**